УДК 069.12:94(476.1)Тышкевічы

**С. І. Гамеза,**
*дырэктар ДУК «Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў», Лагойск*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ МАГНАЦКАГА РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ СРОДКАМІ ВІЗУАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ПРАЗ ДЗЕЙНАСЦЬ ДУК «ЛАГОЙСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ ІМЯ КАНСТАНЦІНА І ЯЎСТАФІЯ ТЫШКЕВІЧАЎ»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу некалькіх стагоддзяў, пачынаючы з 1528 г., старажытным Лагойскам валодаў знатны род Тышкевічаў, прадстаўнікі якога праявілі сябе рупліўцамі па захаванні гістарычнай спадчыны свайго народа. Намаганнямі братоў Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, вядомых археолагаў, этнографаў, краязнаўцаў, быў адкрыты ў 1842 г. у родавым маёнтку Лагойск першы публічны гісторыка-археалагічны музей – адзін з лепшых беларускіх прыватнаўласніцкіх музеяў, які праіснаваў да 1855 г.

Другое жыццё музей у Лагойску атрымаў у 2003 г. На сённяшні дзень ён налічвае 11 875 адзінак захоўвання, якія дастаткова поўна адлюстроўваюць унікальнасць і самабытнасць гістарычнай і культурнай спадчыны Лагойшчыны. Гэта рарытэтныя рэчы, каштоўныя экспанаты, якія сістэматызуюцца па калекцыйным прынцыпе наступным чынам:

**Археалогія**. Сучасную калекцыю прадстаўляюць матэрыялы археалагічных раскопак ранненеалітычнай стаянкі «Зацэнне» (4 тыс. год да н. э., археолаг М. М. Чарняўскі), гарадзішча жалезнага веку каля в. Васількоўка (4–5 ст. да н. э., археолаг А. І. Мітрафанаў), курганнага могільніка і селішча каля в. Ізбішча (1-ая палова X ст., археолаг Г. В. Штыхаў), раскопак Лагойскага гарадзішча X–XIII стст. і больш позняга часу (Г. В. Штыхаў), якія захоўваюцца ў фондах музея. Так, прафесар Г. В. Штыхаў перадаў рарытэты раскопак Лагойскага гарадзішча (больш за 1 тыс. экспанатаў), археолаг М. М. Чарняўскі – матэрыялы раскопак ранненеалітычнай стаянкі «Зацэнне»

(80 адзінак). У археалагічнай калекцыі будзе прысутнічаць і больш вузкая калекцыя: «Лагойская кафля».

**Дакументы.** Аснову калекцыі складаюць копіі архіўных дакументаў аб гісторыі Лагойска і арыгінальныя экспанаты з фондаў музея.

**Нумізматыка.** Нумізматычная калекцыя была адной з самых значных у Лагойскім музейным зборы. Лагойск у свой час з’яўляўся даволі буйным гандлёвым цэнтрам (аб чым сведчаць археалагічныя знаходкі: фрагменты амфар, гліняны посуд з высокім вузкім горлам і вялікімі ручкамі, шкляныя бранзалеты з Кіева, спражкі з Балтыі, сланцавыя грузікі для верацёнаў з Валыні і інш.). У Лагойску 2 разы на тыдзень адбываліся кірмашы (па панядзелках і чацвяргах); 3 разы ў год (22 мая, 19 жніўня і 19 снежня) адбываліся буйныя кірмашы, на якія з’язджаліся сяляне з памежных раёнаў. Улічваючы гэта, плануецца калекцыю манет і папяровых грашовых знакаў паказаць разам з калекцыяй розных прыстасаванняў, якія выкарыстоўваліся ў гандлі: вагі, бязмены, гіры і інш. Гэта дазволіць больш цікава прадставіць нумізматыку.

*Зброя.* Экспанаты гэтай калекцыі ўмоўна можна размеркаваць па трох групах:

– археалагічныя знаходкі (наканечнікі стрэл, наканечнікі коп’яў, сякеры, шпоры, асобныя элементы зброі і інш.);

– муляжы ўзбраення і амуніцыі сярэдневяковага рыцара (даспехі, мячы, шчыты, арбалеты, лук са стрэламі і г. д.);

– зброя і асобныя часткі амуніцыі XVI – пачатак XX ст.

*Этнаграфія.* Калекцыя вылучана ў экспазіцыі па той прычыне, што ўсё сваё жыццё браты Тышкевічы прысвяцілі вывучэнню быту, звычаяў, культуры беларусаў, што ўрэшце вылілася ў выданне навуковых прац па гэтай тэматыцы (К. Тышкевіч «Вілія і яе берагі» ў 1871 г., Я. Тышкевіч «Апісанне Барысаўскага павета…» у 1847 г. і г. д.).

*Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.* Калекцыя ў асноўным прадстаўлена ўзорамі абразоў, рэчаў царкоўнага ўжытку, жывапісам на гістарычную тэматыку і іншымі прадметамі мастацтва.

*Калекцыя цікавых рэчаў.* У свой час у кожным прыватным зборы, у тым ліку і ў музеі Тышкевічаў у Лагойску, за гонар лічылася мець розныя экзатычныя рэчы, нешта такое, што магло здзівіць гасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У гэтым раздзеле таксама прысутнічаюць рэчы такога кірунку, якія нейкім чынам вылучаюцца сярод іншых ці сваёй прыгажосцю, незвычайнасцю, маюць цікавую гісторыю свайго бытавання, ці проста належалі нейкай неардынарнай асобе.

Храналагічныя рамкі дадзенага раздзела не абмежаваныя. Так, напрыклад, у фондах ёсць ужо адзін экспанат з гэтай калекцыі – цагліна, якая была выраблена ў XVI ст., з адбіткам лапы сабакі.

З мэтай папаўнення фондаў каштоўнымі экспанатамі супрацоўнікі музея сістэматычна арганізуюць пошукава-даследчыя і этнаграфічныя экспедыцыі па населеных пунктах Лагойскага раёна, а таксама супрацоўнічаюць з навукоўцамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Вядома, што 2022 г. аб’яўлены ў Беларусі Годам гістарычнай памяці з мэтай фарміравання аб’ектыўных адносін грамадскасці да гістарычнага мінулага нашай краіны.

Несумненна, значную ролю ў фарміраванні гістарычнай памяці і патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў іграе музей.

Накоплены рэчавы рад і даследчы матэрыял дазваляюць распрацоўваць інтэрактыўныя выставачныя праекты («Лагойск 4 праз прызму гісторыі», «Імі ганарыцца Лагойск…»), музейна-педагагічныя заняткі (Акадэмія археалогіі «Раскапай гісторыю», «Гісторыя аднаго прадмета»), якія дастаткова поўна раскрываюць тэму навуковай і грамадскай дзейнасці братоў Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў.

Але ж музей – не толькі месца засяроджвання гістарычнай памяці, а таксама і пляцоўка для творчага самавыяўлення і камунікацыі наведвальнікаў.

Асветніцкая работа навуковых супрацоўнікаў музея накіравана на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, сацыялізацыю дзяцей і моладзі. Розным узроставым аўдыторыям даступныя як традыцыйныя формы – аглядныя і тэматычныя экскурсіі па экспазіцыі музея і гістарычным цэнтры горада, лекцыйны курс «Лагойсказнаўства», штогадовыя дзіцячыя навуковыя канферэнцыі «Тышкевіцкія чытанні», мастацкія пленэры, так і нетрадыцыйныя – музейныя ўрокі, інтэрактыўныя заняткі і майстар-класы, квэсты, лялечныя спектаклі тэатра «Батлейка» і інш.

Так, напрыклад, 19 верасня 2019 г. пры музеі запрацавала «Акадэмія археалогіі».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усе ахвочыя хлопцы і дзяўчынкі могуць паспрабаваць сябе ў ролі археолагаў, пры гэтым не чыста тэарэтычна, а на практыцы. Першымі на музейна-педагагічным занятку «Раскапай гісторыю» пабывалі гімназісты, удзельнікі гуртка «Спадчына», якім кіруе іерэй Аляксандр Тарасевіч.

Праграма інтэрактыву складаецца з прагляду мультфільма аб археалогіі, рашэнняў задач на логіку і ўважлівасць і самае цікавае – сапраўдных раскопак. Дзеці, папярэдне разбіўшыся на каманды, пры дапамозе садовага шуфліка здымаюць міліметр за міліметрам пласты зямлі, паводле тэхналогіі раскопак. У пясочніцы, што знаходзіцца ў выставачнай зале, закапаны розныя прадметы. Пасля вымання артэфакта, яго неабходна ачысціць пэндзлікам і скласці на яго пашпарт (замаляваць, вырабіць замеры, даць тэкставае апісанне).

Пасля навуковыя супрацоўнікі расказваюць наведвальнікам гісторыю з’яўлення археалогіі як навукі на землях Беларусі і кожнага раскапанага прадмета.

Па завяршэнні занятку кожны яго ўдзельнік атрымлівае пасведчанне археолага.

Яскравай старонкай у жыцці Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея з’яўляецца правядзенне штогадовай раённай дзіцячай навуковай канферэнцыі «Тышкевіцкія чытанні» і раённага дзіцячага мастацкага Тышкевіцкага пленэра. Вынікі – навуковыя і мастацкія працы юных удзельнікаў мерапрыемстваў – захоўваюцца ў фондах музея.

Адметна і тое, што ў 2021 г. супрацоўнікі музея распрацавалі квэст-экскурсію па гістарычным цэнтры горада «Загадкі майго краю», які праходзіць пад дэвізам «Чужое ведаць цікава, а сваё – неабходна!».

Падчас падарожжа па памятных мясцінах Лагойска экскурсанты з дапамогай фотападказак самастойна знаёміліся з гісторыяй роднага горада. Яны даведаліся, калі і дзе быў заснаваны старажытны Лагойск, хто такія Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы, дзе знаходзіліся «графскі халадзільнік», Чырвоная плошча, цэнтр палітычнага жыцця горада і іншыя гістарычныя аб’екты, каля якіх было зроблена памятнае фота. У канцы мерапрыемства ўсім былі ўручаны сувеніры ў выглядзе керамічнага герба Лагойска і дадзена хатняе заданне: вывучыць сімволіку роднага горада. Тым самым і была вызначана тэматыка наступнай сустрэчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таксама, на працягу апошніх пяці гадоў, пры музеі дзейнічае лялечны тэатр «Батлейка», які карыстаецца асаблівай папулярнасцю не толькі ў жыхароў Лагойскага краю, але і ў замежных турыстаў. Спектаклі «Цар Ірад», «Страх па мянушцы Страх» і інш. дэманструюцца напярэдадні такіх рэлігійных свят, як Раство Хрыстова, Светлая Пасха, а таксама ў рамках розных тэматычных мерапрыемстваў не толькі ў музеі, але таксама практыкуюцца выезды ў школы Лагойскага і Вілейскага раёнаў.

Штогод стала добрай традыцыяй адзначаць Міжнародны дзень музеяў, які афіцыйна святкуецца 18 мая. І 2022 г. – не выключэнне.

У суботу, 21 мая, у Лагойскім гісторыка-краязнаўчым музеі адбылося святочнае мерапрыемства «Лагойск праз прызму гісторыі», прымеркаванае да 180-годдзя з дня заснавання графамі Канстанцінам і Яўстафіем Тышкевічамі ў 1842 г. у родавым маёнтку Лагойск першага ў Беларусі публічнага музея. Менавіта гэта стала падставай для правядзення навуковай канферэнцыі «Сучасныя даследаванні айчыннай гісторыі ў кантэксце навуковай і грамадскай дзейнасці графаў Тышкевічаў», у якой прынялі ўдзел вядучыя навукоўцы і зацікаўленыя краязнаўцы нашай краіны (А. І. Смолік, А. А. Трусаў, І. Н. Колабава, А. М. Нароўская, А. В. Вайцяховіч, С. М. Немагай).

Паралельна з канферэнцыяй прайшла касцюміраваная экскурсія па гістарычным цэнтры горада.

Яскравай падзеяй дня стала відовішчнае выступленне коннагістарычнага клуба «Залатая шпора» ў стылі палявання графа Тышкевіча.

Пасля завяршэння шоу госці змаглі атрымаць асалоду ад музыкі XIX ст. На канцэрце прагучалі песні ў выкананні салісткі Белдзяржфілармоніі Галіны Сакольнік. Акампаніравала ёй удзельніца навуковай канферэнцыі, загадчык кафедры мастацкай творчасці і прадзюсарства ІСВ імя Шырокава Святлана Немагай. Яна расказала слухачам, што ў родзе Тышкевічаў былі кампазітары, а Яўстафій Тышкевіч і зусім праспансіраваў паездку Станіслава Манюшкі ў Санкт-Пецярбург.

Вельмі аўтэнтычна прагучалі песні вышэйзгаданага кампазітара ў выкананні меца-сапрана Галіны Сакольнік. Кампазіцыі, праспяваныя ёю, былі напісаны на вершы Яна Чачота, Уладзіслава Сыракомлі, Адама Міцкевіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Скончыўся Міжнародны дзень музеяў батлеечнымі інтэрмедыямі XVIII ст. у выкананні Андрэя Рэцікава, лялькавода з Наваполацка, аніміраванымі экскурсіямі па экспазіцыі музея, а таксама агляднай экскурсіяй па выставе мастацкіх работ юных удзельнікаў IV Тышкевіцкага пленэра.

Акрамя ўнутрымузейнай дзейнасці, супрацоўнікі Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея з перасоўнымі экспазіцыямі, якія прысвечаны грамадскай і навуковай дзейнасці братоў Тышкевічаў, прымаюць удзел у разнастайных абласных і рэспубліканскіх святах і мерапрыемствах: Нацыянальны форум «Музеі Беларусі», фестываль гістарычных рэканструкцый «Нясвіж – 2021», Нацыянальны фестываль народнай песні і паэзіі «Маладзечна – 2022» і інш.

З мэтай папулярызацыі гісторыі Лагойска і, у прыватнасці, дзейнасці ДУК «Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў», на базе музея ствараюцца відэапрэзентацыі, ролікі, віртуальныя выставы і анлайн-экскурсіі, якія можна паглядзець і наведаць у Internet-прасторы.

Такім чынам, падобныя мерапрыемствы, на мой погляд, вельмі актуальныя і важныя для цяперашняга часу, бо яны скіраваны на захаванне гістарычнай памяці і перадачы яе пакаленням. Менавіта скрозь прызму такіх інтэрактываў сучасная моладзь будзе мець выдатную магчымасць даведацца пра бясспрэчную значнасць гісторыі сваёй малой радзімы і знакамітых землякоў, якія яе будавалі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 351.853.1+712Тышкевичи

**Ю. И. Кнатько,**
*кандидат культурологии, доцент,*
*доцент кафедры культурологии учреждения образования*
*«Белорусский государственный университет*
*культуры и искусств»*, Минск

## ВИЗУАЛИЗАЦИЯ АРХИТЕКТУРНОГО НАСЛЕДИЯ ТЫШКЕВИЧЕЙ В ТВОРЧЕСТВЕ НАПОЛЕОНА ОРДЫ

Архитектурное наследие магнатского рода Тышкевичей на территории современной Беларуси сохранилось фрагментарно